# АРГАННАЯ КУЛЬТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ АРХЕТЫПАЎ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

**Сурба А.В.**
*выкладчык кафедры этналогіі і фальклору*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Багацейшая культурна-гістарычная спадчына беларускага народа патрабуе да сябе сёння, на пачатку XXI стагоддзя пільнай увагі, падрабязнага вывучэння і аб’ектыўнай навукова-гістарычнай ацэнкі. Некаторыя галіны беларускага мастацтва да сёняшняй пары застаюцца недастаткова вывучаны, у прыватнасці важнай яе часткі – духоўнай, каталіцкай. Менавіта тут выяўляюцца трывалыя кантакты беларускай культуры з заходнееўрапейскай, і менавіта яна дазваляе асэнсаваць нашу нацыянальную культуру як частку агульнаеўрапейскага культурна-гістарычнага працэсу. Сёння неабходнасць даследавання гэтай навуковай сферы з’яўляецца відавочнай.

Як вядома, значная частка духоўнай каталіцкай традыцыі звязана з арганамі. Досыць доўгі час у Беларусі час гэтай праблематыцы не ўдзялялася аніякай увагі. На фоне досыць дасканалай вывучанай сферай гэтай праблематыкі з’яўляецца рэпертуар, а таксама канструкцыя гэтага інструменту. Паняцце “беларуская аргання культура” сёння даследчыкамі звязваецца з бытаваннем аргана ў межах Вялікага Княства Літоўскага, а таксама Рэчы Паспалітай. З другога боку на падставе гістарычных фактаў вывучаецца адлюстраванне ўсіх еўрапейскіх духоўных працэсаў – складовай адзінцы канфесійнага і культурнага абшару Заходняй Еўропы.

На працягу стагоддзяў цэлы абсяг беларускай музычнай культуры развіваўся як складовая частка Заходнееўрапейскай культуры. Гэта сталася магчымым праз каталіцтва, якое пачало сваё афіцыйнае сталае існаванне ў Беларусі ўжо у XIII ст., разам з праваслаўем. Далучэнне да канфесійна-культурнай глебы Заходняй Еўропы паспрыяла адлюстраванню ў Беларусі ўсіх працэсаў руху мастацкіх эпохаў, што выявілася ня толькі ў простым пераймані прынцыповых патрабаванняў і заканамернасцяў пэўнай эпохі, але і ў яскравых нацыянальнах адметных рысах [1].

Насамрэч прыняцце хрысціянства супала з уздымам духоўных інтэнцый і пошукаў беларусаў у сферы сакральнага. Да XIII ст. у Беларусі панавала паганства, на ўзроўні з афіцыйным праваслаўем [2]. Гэты феномен характэрызаваўся пэўным сінкрэтызмам: арыгінальным сплавам хрысціянства і паганства. Паганства праяўлялася ў такой сферы, як бытавая магія. Свет тагачаснага беларуса быў напоўнены цудам ва ўсім, што яго акружала. Гэтыя інтэнцыі распаўсюдзіліся і на новую рэлігію – хрысціянства. Таму прыняцце каталіцтва ў названы перыяд досыць заканамерны і явіў сабой хлях да самазрэалізацыі ў сферы духоўнага.

Для разумення этапаў станаўлення арганнай культуры, мы паспрабуем звязаць яго з канцэпцыяй архетыпаў, прасачыць яго дынаміку ў кантэксце Сярэднявечнай Еўрапейскай цывілізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца аналіз Еўрапейскага мастацтва ў кантэксце антычных архетыпаў і яго сувязь з арганнай культурай. Аб’ектам даследавання з’яўляецца быццё духоўнага і яго ўвасабленне ў мастацтве. Прадметам з’яўляецца арган і яго прататыпы.

Такім чынам мы сфармулюем асноўную праблему артыкула: чаму з’яўляюцца на Беларусі арганы, з чым гэта звязана; якія працэсы праходзілі ў станаўленні Заходняй Сярэднявечнай царкве, а таксама, якім чынам гэтыя механізмы, і умовы іх працы, карэлявалі паміж сабой.

Як вядома, гісторыя, мастацтва, філасофія развіваюцца пэўным рытмам і перыядам [3]. Іх калебанні могуць не супадаць паміж сабой, што з’яўляецца досыць складанай задачай іх атрыбутацыі. Таму паслядоўная сістэмнасць назіраецца на невялікіх, у кантэксце гісторыі, перыядах. Давайце звернемся да адной з з такіх мадэляў: сакралізацыі і секулярызацыі. Такая мадэль паўстала пад уплывам яшчэ больш старажытных цывілізацый, такіх як Старажытны Егіпет, а таксама Вавілона і Акадзіі [4].

Адкуль узяліся гэтыя дыхатамічныя ідэялістычныя прынцыпы? Яны паўсталі на глебе канцэптуальнага вывучэння стражытных крыніц (пераважна антычных) большай частай якіх уяўляюць свецкі характар. Але нагледзячы на тое, што яны амаль не захавалі рэлігійнай (сакральнай) састаўляючай, уплыў на свецкую літаратуру (а значыць на філасофію і мастацтва) у значнай ступені прысутнічае. Гэта дае падставу рабіць вывады пра стройную і распрацаваную сітэму рэлігійнай думкі.

*Сакралізацыя* (ад лат. sacrum-святое, супрацьпастаўленне мірскому, матэрыяльнаму) – надзяленне прадметаў, аб’ектаў, працэсаў і інш. святым сэнсам, звязаным з асобай праявай Боскай волі. *Секулярызацыя* – гэта працэс адваротны; працэс разумення рэлігійнасці як спецыфічнай сістэмы палітыкі, будуючыхся на прынцыпах дэмакратыі [5]. Першапачаткова такая мадэль разгледжвала антычную гісторыю, потым гэтыя катэгорыі экстрапаліраваліся на паняцці свецкага і сакральнага ў досыць вузкім сэнсе: царква і ўлада, хаця больш шырока такія плыні могуць прысутнічаць і ў іх. Мы паспрабуем прымяніць гэтую методыку на мысленне Сярэднявечнай Еўропы, незалежна ад канфесіі ў кантэксце архетыпічных вобразаў у падсвядомасці.

Прасачыць перыяды і эвалюцыю мыслення, як нам падаецца можна абапіраючыся на некаторыя “маркерныя” факты з гісторыі мастацтваў, філасофіі і сацыяльнай думкі.

Першыя вядомыя нам тэндэнцыя сакральнасці і секулярнасці адзначаны ўжо ў Старажытным Егіпце. Напрыклад рэформа Эхнатона, звязаная з культам сонца, як адзінага Бога-Атона з’яўляецца актам сакралізацыі, на фоне дасканала распацаванай сістэмы жрэчыства, з рознымі багамі ды рытуаламі, якія насілі, увогуле для нацыі, фармальны характар і не залежылі ад містычнага стану фараона [6]. Але такія павароты вельмі жорстка караюцца – да гэтага мы звернемся ніжэй.

Антычнасць, па меркаванню Ф.Ф. Зялінскага, заставіла нам больш яскравых сведчанняў гэтай дыхатаміі. Звернемся да асноўных перыдаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Ахейскі перыяд (да VII ст. да н.э.). Характарызуецца гамераўскай паэзіяй, максімальна секулярызаваны.

2. Элінскі перыяд (VII–VI ст. да н.э.). Даводзіць сакралізацыю дая яе прыдзела, развіваецца храмавая архетыктура, сакральная скульптура, жывапіс, дэльфійскае жрэчаства, культ алімпійскіх багоў, містычныя рэлігіі Дзіметры і Дыоніса.

3. Аттычны перыяд (V–IV ст. да н.э.). Найбольш пладавіты і значны перыяд у гісторыі антычнай культуры. Паварот у бок секулярызацыі. Архітэктура ставіць свецкія задачы, скульптура прысвячае сябе не толькі багам, але атлетам і выдатным дзеячам. Пачынаюцца распаўсюджвацца бліжнеўсходнія культы. Развіваецца класічная філасофія, зараджэнне сучаснага рацыяналізму.

4. Эліністычны перыяд (каля I ст. да н.э.). Перыяд максімальнай сакралізацыі рэлігійнай думкі. Нараджэнне двух містычных плыняў: неаплатанізму і хрысціянства.

5. Перыяд імператарскага Рыму (каля II ст н.э.). Частоковы зварот да страчанай секулярызацыі.

6. Пачатак хрысціянскага перыяду (пачатак сярэднявечча, VI ст. н.э.). Зноў зварот да сакралізацыі [4].

Для таго, каб уявіць больш яскрава і ў духе антычнай вобразнасці гэтыя калебанні, мы звярнемся да канцэпцыі філосафа Ф.В. Ніцшэ. Ён прапанаваў разгледжваць мастацкую думку праз прызму двух асноўных мастацкіх ідыялістычных плыняў: дыянісійскі і апаланічны пачатакі. Апалон – гэта нябесны, сонечны бог, сын Зеўса, утварае сонечны пачатак, насіцель боскага тварэння: “Апалон бог усёй моцы, творачы вобразамі, ёсць у той жа час і бог, які кажа ісціну, прарочыць будучыню”. Дыяніс – насупраць, пачатак зямнога, бог пладароддзя, гаспадар расліннасці, земляробства, вінаграднай лазы ды вінакураў [7]. Дыяніс – бог вяселля, радасці і буйства. Хоць міфы і расказваюць нам адкуль з’явіліся гэтыя багі, усёж можна канцэптуальна асэнсаваць іх каранні. Ад пачатку ахейскага перыяду, Грэцыя заставалася досыць секулярызаванай, таму з’яўленне тут прататыпаў Апалона -Геліуса досыць заканамерна. Але пачынаючы з элінскага перыяду, у культах Грэцыі з’яуляюцца Усходняя містычнасць з Вавілону ды Аркадзіі [4]. Адным з першых стаў Пан, казлападобны сацір граючы на флейце-сірынге. Культ Дыоніса пайшоў з Фракіі ад бога Адона, альбо Адоніса, магчыма звязаным з культам Егіпецкага Атона, з пазіцыі цыпла і жыццёвай энергіі [8]. Тут паўстаюць вельмі важныя акалічнасці: калі адзін – увасабленне моцы, святла і дарычнаці, а другі – творчага экстазу, таямнічасці і жыцця, то такім жа самым прынцыпам і падзяліліся і іх уплыў на мастацтва і музычныя інструменты ў прыватнасці. Сімвалам Апалона з’яўляецца струнная кіфара, альбо ліра, а сімвалам Дыоніся лічыцца духавая сірынга, альбо флейта Пана. Для разумення адрознення перцэпцыі гуку неаходна параўнаць нацягнутую струну з раслінай трубкай (фалічны сімвал).

Такім чынам, пачатак Апалона – закон, перамога. Пачатак Дыяніса – містычны экстаз. Становіцца відавочна, што сакралізацыя гэта праява

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дыянісійскага пачатку, а секулярызацыя – апаланічнага. Гэтыя пачаткі праявіліся і праяўляюцца ў Еўрапейскім мастацтве, закранулі філасофскую думку, а таксама хрысціянства.

Услед за афіцыйным прыняццем хрысціянства ў IV ст. н.э, сакралізацыя змяняецца секулярызацыяй. Яно становіцца флагманам Рымскай імперыі і сімвалам вярхоўнай улады. Апалагеты царквы абасноўваюць патэнцыі хрысціянства перад “язычнікамі Элады” (ва уласнасці містычны рух нэаплатанізму). Усе музычныя інструменты старажытнасці амаль неўжываюцца ў сакральнай практыцы, акрамя манахорда (ступны фрыкцыйны інструмент) .

З VI па VIII ст. адбываецца рух, які завецц “іконаборства”, выступае супраць іконаў, чым падкрэслівае сакральны характар у дачыненнях з Богам. У VII ст. вердыктам папы Рымскага Віталіана арган быў дазволен у царкве. Нягледзячы на тое, што рух іканаборства заціхае да IX ст. набірае рух арганная музыка. Нездарма мы звярнуліся да такога малазначнага факту ў кантэксце філасофскага мыслення.

Каб асмысліць гэты факт звярнемся да міфу. Сапраўды ўлюбёным музычным інструмента саціра Пана (выхавцеля і настаўніка Дыоніса) была сірынга (флейта Пана). Яна з’явілася пасля таго, як Пан улюбіўся ў прыгажуню-німфу Сірынгу і пасля яе пераўтварэння ў чарот, ён зрабіў яго некалькіх трубак флейту, іграа на якой нагадвала саціру прыгажосць, а таксама абастрала светлыя і высокія пачуцці [9]. Трэба адмеціць факт таксама элемент жалю па страчанаму каханню, а таксама мінорнасці мелодыкі.

Адпаведна канцэпцыі К.Г. Юнга, вобраз Сірынгі можна трактаваць згодна пэўнаму архетыпу [10]. Насамрэч, Сірынга з’яўляецца правобразам прыгажосці, некранутасці і сарамлівасці, у сваю чаргу сірынга-флейта – гэта правобраз жаночасці, дзявіцтва, жалю і ідыяльнага кахання кахання. Такім чынам атрымліваем сінтэтычнае паняцце архетыпу Сірынгі, як правобраза некранутага, чыстага кахання, якое здзяйсняецца толькі пад гукі музыкі. Гэтая інтэрпрытацыя вобразу не звязана з канструкцыяй флейты, але падкрэслівае раслінную субстанцыю вобразу, пэўную метамарфозу пачуццяў.

Чаму менавіта арган становіцца атрыбутам сакралізацыі, пачынаючы ад VII ст.? Гэта звязана з этапам змяняючыхся эпох: спачатку вылілася ў сакральны акт тэургічнай сувязі без яе матэрыялізацыі ў вобразах (іконах), а потым, калі арганная музыка была дазволена, ўсе патэнцыі ў дачыненнях з трансцэндэнтным, сублімавалі ў музыку. Але тут справа не толькі ў музыцы, як такой, а, як нам падаецца, ў архетыпічным вобразе Сірынгі.

З гісторыі аргана нам вядома, што прататыпам з’яўляецца наборная флейта Пана, якая з цягам часу мадыфікавала і механізавалася да гідраўласа. Па-сутнасці гэта і быў першы арган ў сучасным разуменні [11]. Доўгі час пасля афіцыйнага прыняцця хрысціянства, арган афіцыйна не выкарыстоўваўся і лічыўся язычніцкім.

Давайце прадставім механізм увода арганнай практыкі ў літургічнае жыццё. Па-першае інтэнцыйная сакральная думка не прымала матэрыяльных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобразаў (ікон). Па-другое, увядзенне аргана, дазволіла зняць напругу з “іканаборцаў” перанаправіць (сублімаваць) боскія дачыненні з сферы матэрыяльнага ў сферу архетыпічнага, духоўнага, падсвядомага. Ікона, як кананічны вобраз ўсёж такі застаўся ў царкве і ўсялякія патугі на яе адмену скончыліся. Па-трэцяе, наяўнясць субстрату аргана – архетыпу-Сірынгі яшчэ не дазваляе ўспрымаць яго цэласна, таму павінен быў з’явіцца пэўны акцыдэнтны вобраз гэтага архетыпу. А менавіта вобразу чысціні, нявіннасці і некранутага кахання. Так мы бачым у гэтай інтэнцыі глыбінны архетып Сірынгі, якая ўвасабляецца ў вобразе флейты, альбо больш позняга аргана. Такім вобразам у часы высокага і позняга Сярэднявечча з’яўвіўся вобраз Прэчыстай Дзевы Марыі (XII–XIV стст.). Хрысціянская дагматыка на той час ўжо мела некаторы вопыт па адаптацыі антычны язычніцкіх вобразаў ў хрысціянства, таму недастача цэласнай карціны была васпоўнена. Да культу вобраза ідэальнай жанчыны далучыліся таксама трубадуры, ваганты і шпільманы. Яны пелі пра сваю Даму Сэрца, ідэалізуючы яе вобраз да самагэ прэдзелу, ставілі перад сабой мэту служэння ёй. Практычнае ўкараненне культу жанчын зрэалізавалася ў інстытуце рыцарства.

У цэлым, перыяд сакралізацыі з VI па XV стст. характэрызаваўся пастаянным прыростам сакральнасці. Так мы ведаем, што культ Дзевы Марыі ўсталяваўся да XIII ст, арганы атрымалі наўбольшае развіццё да XIII–XIV ст. Яшчэ аднім атрыбутыўным феноменам позняга Сярэднявечч з’яўляецц готыка. Гэтая плыня прыйшла на змену раманскаму стылю ў XIII–XIV стст. У перакладзе з італьянскай мовы (gotico – варварскі), ўпершыню ў сучасным сэнсе высказаў Джорджо Вазары, дзеля таго каб аддзяліць Сярэднявечча ад пазнейшага за ім Рэнесанса. Гатычнае мастацтва было культавым па назначэнню і рэлігійным па тэматыцы. Яно звярталася да вышэйшых боскіх сіл, вечнасці. хрысціянскага міраўспрымання [12] і мае досыць пэўны вобраз архетыпічнай ментальнасці.

Канешне ўвядзенне культу Дзевы Марыі і аргана павінна было быць дапоўнена адпаведным інтэр’ерам. Архетым Сірынга досыць яскрава малюе нам лес, поўны цудаў і жыцця, варожы і добры, ў якім жыве Пан, казланогі сацір, адзінокі і ўродлівы. Архетып лесу як неадменнны атрыбут духоўнай музыкі і Прэчыстай Дзевы павінен быў матэрыялізавацца. Кроны дрэваў, якія сходзяцца ўверсе, вострыя шпілі, атаксама вобразы небяспечнага зла і чалавечай годнасці. Усё гэта мы знойдзем у гатычным храме. Скульптура готыкі нагадвае нам пра сілы зла і дабра, яны узаемадзейнічая спалучаць светавую гульню, а яна ў сваю чаргу ажыўляе, адухатварае архітэктурныя массы і спрыяе іх узаемадзеянню з чалавекам. Такім чынам можна правесці пэўныя аналогіі: Сірынга-Дзева Марыя, флейта Пана-арган, лес-гатычны храм.

Аднак трэба разумець сярэднявечная сакралізацыя не праходзіла раўнамерна, яна развівалася ва ўмовах дыялектыкі мыслення: з аднаго боку матэрыі, з другога архетыпічнай ментальнасці. Так ці інакш, можна сцвярджаць, што названы перыяд быў строга інтэнцыйным. Але такія бескампрамісныя лініі развіцця павінны былі прывесці да рэлігійнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фанатызму і частковага адыходу ў эзатэрыку і магію хоць і ва ўлоне хрысціянства.

Пачынаўчы з XIII ст., усё больш распаўсюджваецца містычны фанатызм, які выліваецца ў “ахоту на ведзьм”. У 1215 годзе папа Інакенцій III ўводзіць асобы царкоўны суд, пад назвай “Інквізіцыя” [13]. Гэты феномен цяжка расслумачыць, але сверх ідэалізацыя жанчыны ў вобразе Дзевы Марыі, дагматызацыя ідэалаў кахання, як некранутага і недасягальнага, значна на гэта паўплывала. У такіх ўмовах звычайная зямная (смяротная) жанчына павінна разглядацца як парочная, брудная і, як вынік, грахоўная. Менавіта жанчыне прыпісалі сэксуальную сувязь з д’яблам, каб расслумачыць несуізмяральнасць двух пачаткаў кахання: зямнога бруднага і чыстага некранутага нябеснага.

Пераход да секулярнага яшчэ быў далёка, але адмецім наступнае: першы маркерны факт пачатку наступлення секулярнасці – Тамаш Аквінскі. Ён спалучаў рацыяналізм Аттычнага перыяда Старажытнай Грэцыі з хрысціянствам і стаў вядомы як вялікі схаласт. Цікава, што праз сваё вучэнне, ён не бачыў месца аргану [1]. За такім маленькім фактам стаіць цэлае непрыняцце архетыпу, бо яго месца заняў іншы – Апалон. Свайго наўвышэйшага ўздыму секулярны Апалон дабіўся ў Новы Час.

Уся эпоха Адраджэння ішла да секулярнасці, аднак метады былі рознымі, нават прыйшлыя ад сакральнага. Напрыклад інквізіцыя у часы Рэнесансу і Новага Часу не адыгрывала вырашаючай ролі: акты аб пакаранні падпісывалі свецкія суды. Такім чынам свецкая улада (архетып Апалона) укараняла свае пазіцыі метадамі Дыоніса. Містыцызм музыкі не прыйшойся на службу дзяржаўнай свецкай уладзе. Нават І.С. Бах, надзвычай таленавіты арганіст так не быў прыняты сваім часам. Ён быў адроджанны якраз у эпоху рамантызму.

Такім чынам мы сцвярджаем, што чалавецтва жыве згодна міравому маятніку, які калеблецца ад самага пачатку існавання сталага чалавека. Робячы свае калебанне ад сакральнага да секулярнага, ён застаўляе нас па-іншаму паглядзець на сваю існасць і быццё. Такая барацьба, напэўна нарадзілася ад часоў панавання неандартальца, калі развіваюцца аддзелы мозга, адказныя за анімістычнае пачуццё, яны першыя пачалі хаваць сваіх продкаў; паралельна развіваліся і рацыянальныя здольнасці краманьёнцаў [14]. Той факт што барацьба вядзецца не толькі ў ментальнасці чалавека, яна спасобна захватываць цэлыя пакаленні і цывілізацыі, сведчыць пра адзіныя мэты і інтэнцыі чалавецтва.

На наш погляд самым якасным фактарам адслежвання гэтых тэндэнцый, з’яўляецца мастацтва. Менавіта ў ім максімальна хутка сублімуюцца нашы патэнцыі сакральнага і секулярнага. Неабходнасць даследвання гэтых працэсаў абумоўлена разуменнем патрэбаў, а таксама псіхозаў і неўрозаў на ўзроўні цывілізацыі для таго каб хутка і якасна лячыць рудзіментарныя формы былога цыклу [15].

Якім бы чынам не зрэалізаваліся гэтыя дзве плыні, неабходна своечасова асмысляць прычыны іх станаўлення і развіцця. Нягледзячы на тое, што арган,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як прататып духоўнасці быў распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі пчынаючы з XIII ст, а наўбольшая іх колькасць дасягае к XVI–XVI стст, можна прасследзіць пэўную заканамернасць і прыемнасць агульнага наследдзя Еўрапейскай цывілізацыі, на якую ў сваю чаргу паўплывала Антычнасць.

Сучасны стан беларускай арганнай культуры ёсць толькі шэрым адлюстраваннем былых дасягненняў, зменаў мастацкіх і гістарычных эпохаў. Большасць з ацалелых арганаў выраблены ў XVIII–XIX стст. [1]. Але гэты факт score неможа аправергнуць таго, што развіццё арганнай культуры на Беларусі звязаны з аналагічнымі з Еўропай працэсамі сакралізацыі. У апошнія дзесяцігоддзі да арганаў зноў з'явіўся інтарэс, што, мабыць з'яўляецца зваротам да страчанай сакральнасці. Арганы XIX ст., з'яўляюцца нашчадкамі матэрыялізацыі сакральнага, і цікавасць да арганаў імпліцытна закладзена ў цікавасці і звароце да архетыпу-Сірынгі. Таму шлях да яе носіць інтуітыўны характар, але можна прследзіць асноўныя этапы: спачатку вывучэнне і асмысленне працэсаў выканальніцкай сферы, канструцыі арганаў, затым працэс рэстаўрацыі і кансервацыі, з паралельным аднаўленнем школы выканання. Апошні этап – гэта творчасць, свабодная ад канону, якая павінна далучыць нас да разумення самых сакральных і патаемных сфераў быцця, сферы архетыпу Сірынгі.


1. *Неўдах, У.* Cantantibus Organis. Беларуская арганная культура ў кантэксце эўрапейскага музычна-гістарычнага працэчу. / У. Неўдах. – Мінск : Тэхналогія, 1999.

2. *Дубянецкі, Э. С.* Язычніцтва / Э.С. Дубянецкі // Беларус. Энцыкл. : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т.18, Кн. 1. – С. 247.

3. *Тойнби, А. Дж.* Постижение истории / А. Дж. Тойнби. – М. : Айрис Пресс, 2002.

4. *Зелинский, Ф. Ф.* Эллинская религия / Ф. Ф. Зелинский. – Минск : Эконом-пресс, 2003.

5. Философский словарь / А.П. Алексеев, Г.Г. Васильев [и др.]; под ред. А. П. Алексеева. – М. , 2009.

6. *Вейгалл, А.* Эхнатон. Фараон-вероотступник / А. Вейгалл. – М. : Центр-полиграф, 2004.

7. *Ницше, Ф.* Рождение трагедии из духа музыки / Ф. Ницше. – М. , 2003.

8. *Иванов, Вяч.* Дионис и прадионисийство / Вяч. Иванов. – СПб. : Алетейя, 1994.

9. *Кун, Н.* Легенды и мифы Древней Греции / Н. Кун. – М. , 2009.

10. *Юнг, К.Г.* Душа и миф: шесть архетипов / К.Г. Юнг. – Киев : Государственная библиотека Украины для юношества, 1996.

11. *Sachs, C.* Historia instrumentow muzycznych / C. Sachs. – Warszawa : Panstwowe Wydawnictwo Naukowe, 1975.

12. *Suckale, R.* Malerei der Gotik. Taschens Epochen und Stile / R. Suckale, M. Weniger. – Taschen, 1999.

13. Колдовство в Средние века: Подлинная история магии / пер. с англ. Н. Масловой; предисл. и послесл. Н. Горелова. – СПб. : Азбука-классика, 2009.

14. *Франкл, Дж.* Археология ума / Дж. Франкл. – М. : Астрель, 2007.

15. *Франкл, Дж.* Цивилизация: утопия и трагедия / Дж. Франкл. – М. : Астрель, 2007.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ